# Легендарнаму тэатру прысвячаецца

## *Купалаўскі як сімвал нацыянальнай культуры*




Афіша ўрачыстага адкрыцця тэатра ў 1920 годзе.

**У верасні краіна будзе святкаваць 100-годдзе з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага тэатра, які ў наш час носіць гордае імя — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Безумоўна, такая знакавая для беларускай культуры дата адзначыцца цэлым шэрагам урачыстых мерапрыемстваў. Тэматычная выстава з красамоўнай назвай “Сімвал нацыянальнай беларускай культуры” рыхтуецца і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Якім чынам галоўная захавальніца кніжных багаццяў нацыі зробіць свой унёсак ў справу прэзентацыі юбілейнай даты першага і вельмі любімага публікай нацыянальнага тэатра, і якія цікавосткі будуць прапанаваны да ўвагі наведвальнікаў выставы — чытайце ніжэй.**

Антон РУДАК /
Фота аўтара



Эскізы касцюмаў да спектакля “Паўлінка”. Мастак Барыс Малкін, 1944 год.

Аб працы над экспазіцыяй, якая будзе прэзентаваная 20 жніўня ў галерэі “Атрыум” на трэцім паверсе Нацыянальнай бібліятэкі, нам распавяла загадчык сектара арганізацыі кніжных выстаў Ксенія Жукоўская, якая займаецца падрыхтоўкай гэтага мерапрыемства разам з вядучым метадыстам Надзеяй Красуцкай. Зрэшты, над экспазіцыяй дбайна працуе ўвесь аддзел галерэйна-выставачнай справы, бо арганізацыя выставы вымагае вялікіх дызайнерскіх і афарміцельскіх высілкаў.

Ксенія Жукоўская адзначае, што падобныя праекты, звязаныя з тэатральным жыццём краіны, ладзіліся ў бібліятэцы і раней — напрыклад, у 2018 годзе адбылася выстава, прысвечаная 85-годдзю з дня заснавання Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. Але сёлетняя экспазіцыя, бадай, мае быць яшчэ больш маштабнай, і комплексна адлюструе ўвесь стогадовы шлях купалаўцаў.

На выставе наведвальнікі пабачаць прадстаўленыя афішы да спектакляў, эскізы сцэнаграфіі, каштоўныя рэдкія здымкі найбагацейшай гісторыі тэатра. Дакументы, што змесцяць у экспазіцыі, збольшага, безумоўна, паходзяць са збораў самой Нацыянальнай бібліятэкі, але частку прадставілі для экспанавання і прыватныя калекцыянеры. Сярод кніжных цікавостак заўзятарам чытання прэзентуюць раннія выданні аўтараў, чые творы на працягу дзесяцігоддзяў ажыццяўляліся многімі пакаленнямі рэжысёраў і артыстаў легендарнай трупы. Таксама тут можна будзе пабачыць цікавыя рарытэтныя выданні па гісторыі тэатра, працы тэатральных крытыкаў. Значную частку экспанатаў прадаставіў са сваіх архіваў і сам Купалаўскі, агулам жа публіцы пакажуць больш за 150 прадметаў.

Выстава пабудаваная паводле храналагічнага прынцыпу і раскрые гісторыю развіцця ды станаўлення тэатра па асноўных вехах яго шляху. Нададзеная ўвага і дарэвалюцыйнаму перыяду, то бок часу, калі ў будынку сённяшняга Купалаўскага дзейнічаў мінскі гарадскі зімовы тэатр. Зрэшты, з дня яго заснавання на гэты год сама прыпадае круглая дата — ён адчыніў свае дзверы для прыхільнікаў Мельпамены ў 1890-м, у чым можна ўпэўніцца дзякуючы найстарэйшаму экспанату выставы — вытрымцы з падшыўкі тагачаснай газеты “Мінскі лісток”, дзе была змешчаная зацемка аб урачыстым адкрыцці гарадскога тэатра. А пра падзеі, звязаныя з датай заснавання ўжо 1 Беларускага дзяржаўнага тэатра, будзе сведчыць афіша прэм’ерных спектакляў, пастаўленых у Мінску ў верасні 1920 года. Тады беларуская трупа прадставіла на суд гледачоў спектакль “Рысь” паводле аповесці Элізы Ажэшкі, яўрэйская трупа — пастаноўку “Людзі” паводле твору Шолам-Алейхема, а іх рускія калегі — “Вяселле” паводле п’есы Антона Чэхава.



Макет сцэнаграфіі Кацярыны Шымановіч да спектакля “Радзіва Прудок” паводле кнігі Андруся Горвата.

Наступныя ж секцыі пакажуць гісторыю тэатра па дзесяцігоддзях, ад міжваеннай пары і да нашых дзён. Прычым своеасаблівым стрыжнем, які аб’яднае ўвесь шлях калектыву праз гады, зробяцца цытаты з біяграфічных кніг Аляксандра Станюты — сына славутай народнай артысткі, якая дала трапныя ацэнкі творчасці і лёсам многіх сваіх калег. Акрамя гістарычных дакументаў, важным складнікам экспазіцыі стане выяўленчы шэраг, дзе прадстаўлены сучасныя афішы спектакляў, сцэнаграфія, эскізы касцюмаў.

Адной з безумоўных разынак выставы будуць ілюстрацыі выдатнага мастака-сцэнографа Аскара Марыкса, выхаванца пражскай мастацкай школы, які лічыцца родапачынальнікам аб’ёмнай трохмернай дэкарацыі ў беларускім тэатры. Некаторыя яго работы знаходзяцца ў калекцыях Нацыянальнага мастацкага музея і Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, але для выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы ўнікальныя творы Аскара Марыкса прадаставіў мастак і калекцыянер Ігар Бархаткоў. Тут наведвальнікі пабачаць арыгінальныя эскізы касцюмаў і дэкарацый да п’есы Шэкспіра “Рычард III”. Акрамя работ Аскара Марыкса, прыхільнікі купалаўцаў змогуць пазнаёміцца таксама з альбомамі твораў такіх прызнаных майстроў сцэнаграфіі, як Іван Ушакоў і Барыс Герлаван.

Асобны блок экспанатаў будзе прысвечаны візітнай картцы тэатра — знакамітай “Паўлінцы”. Ксенія Жукоўская адзначае, што сцэнаграфія гэтага спектакля і сёння мае багата агульнага з працамі Барыса Малкіна, выкананымі для пастаноўкі “Паўлінкі” Львом Літвінавым у гады эвакуацыі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Нацыянальны акадэмічны тэатр таксама прадаставіў для паказу на выставе пяць сучасных сцэнічных касцюмаў - тры з іх належаць персанажам купалаўскай “Паўлінкі”, адзін — з “Выкрадання Еўропы” Францішкі Уршулі Радзівіл, і яшчэ адзін — з чэхаўскага “Вяселля”. Што тычыцца найбольш набліжаных да сучаснасці экспанатаў — дык гэта макет сцэнаграфіі Кацярыны Шымановіч да спектакля “Радзіва Прудок” паводле папулярнай кнігі літаратара Андруся Горвата.

Падчас адкрыцця выставы наведвальнікаў чакае інтэрактыўная зона, дзе будуць прадстаўлены прадметы мэблі з тэатральнага рэквізіту. Кожны ахвочы таксама зможа праявіць сваю фантазію і ўласнаручна стварыць паштоўку з віншаваннем на адрас купалаўцаў, якая абавязкова трапіць у тэатр.